вич // Предметная и методическая компетентность как важнейшая составляющая профессионального мастерства преподавателя иностранного языка: материалы Ш общеуниверситет. семинара, Минск, 31 мар. 2016 г. / Белорус. гос. пед. ун-т им. М. Танка; редкол.: А. В. Торхова [и др.]; отв. ред. В. П. Скок. – Минск: БГПУ, 2016. – С. 6–8.
2. *Малевич, В. Г.* Системная концепция формирования научно-образовательного ядра инновационной подготовки по иностранному языку / В. Г. Малевич // Научные труды Республиканского института высшей школы. – Минск: РИВШ, 2016. – Ч. 2. – С. 39–391.

**(Дата подачи: 20.02.2017 г.)**

*А. Л. Міхайлава*
Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П. М. Машэрава, Віцебск

*A. Mikhaylava*
Vitebsk State University named after P. M. Masherov, Vitebsk

**УДК 39:008(=161.3):323.1(476)**

# СУТНАСЦЬ І ЗМЕСТ ПАНЯЦЦЯ «ЭТНАКУЛЬТУРА» Ў КАНТЭКСЦЕ СУЧАСНАГА ЭТАПУ ФАРМІРАВАННЯ БЕЛАРУСКАЙ НАЦЫІ

# THE NATURE AND CONTENT OF THE CONCEPT «ETHNIC CULTURE» IN THE CONTEXT OF THE PRESENT STAGE OF FORMATION OF THE BELARUSIAN NATION

*Артыкул прысвечаны вызначэнню сутнасці і зместу паняцця «этнакультура» на сучасным этапе фарміравання беларускай нацыі. Прадстаўлены аналіз сутнасці паняццяў «нацыя» і «народнасць» у кантэксце нацыянальна-гістарычнага развіцця беларускага народа. Разглядаюцца падыходы да вызначэння сутнасці паняцця «этнакультура» ў працах філосафаў, гісторыкаў, сацыёлагаў, педагогаў, этнографаў. Вызначаюцца кампаненты этнакультуры, да ліку якіх адносяцца этнічная самасвядомасць, мова, сацыяльна-культурныя асаблівасці. Паказаны ўплыў названых кампанентаў на ідэал, прымяняльны не толькі як устойлівая характарыстыка прадстаўнікоў пэўнай супольнасці, але і як мэта ў сямейным і грамадскім выхаванні.*
*Ключавыя словы: менталітэт; народнасць; народны ідэал; нацыя; этнакультура; этнічная самасвядомасць.*

*The article is devoted determination of nature of concept «ethnoculture» at the present stage of formation of the Belarusian nation. The article presents the analysis of essence of concepts «nation» and «nationality» in the context of national historical development of the Belarusian people. Considers approaches to definition of nature of concept «ethnoculture» in the works of philosophers, historians, sociologists, educators, anthropologists. Defines the components of ethnic culture, including ethnic identity, language, socio-cultural characteristics. It shows the influence of these components on the ideal primarely not only as a stable characteristic of members of a particular community, but also as a goal in family and public education.*
*Key words: the mentality; the nation; the national ideal; ethnic culture; ethnic identity.*

Актуальнасць даследавання этнічнай культуры ў сучасным кантэксце фарміравання беларусаў як нацыі абумоўлена шэрагам умоў і абставін, да

ліку якіх адносяцца страта мінулых духоўных каштоўнасцей і агульнакультурных набыткаў, глабалізацыя свядомасці сучаснага пакалення моладзі, іх сацыяльна-каштоўнасных набыткаў, масавая ўрбанізацыя і, адначасова, выміранне вёсак, недастатковая трансляцыя звычаяў і традыцый ад бацькоў да дзяцей, што ў выніку можа прывесці да пагрозы знікнення і немагчымасці адраджэння традыцыйнай культуры.

Тэарэтычнай базай даследавання з'явіўся аналіз філасофскіх, педагагічных, этнапедагагічных, этнаграфічных навуковых прац і артыкулаў, а таксама прац па беларускай народнай педагогіцы ў межах акрэсленай праблематыкі, у якіх:

• вызначаюцца сутнасць і змест паняцця «этнакультура» ў сацыяльна-культурным і антрапалагічным кірунках (гісторыкі: В. К. Бандарчык, Ю. У. Брамлей, Л. М. Гумілёў, С. М. Маліноўская; філосаф Н. А. Люр'я; сацыёлаг М. Вебер; этнографы: Д. М. Анучын, С. М. Шырокагародаў; педагог Г. П. Арлова);

• аналізуецца ўклад асветнікаў, вучоных, этнографаў канца XIX–XX стст. у вылучэнне і змястоўнае апісанне этапаў фарміравання беларускай нацыі і паходжання беларусаў (Д. М. Анучын, В. К. Бандарчык, М. Я. Грынблат, М. Ермаловіч, Я. Ф. Карскі, В. Ластоўскі, У. І. Пічэта, А. К. Сержпутоўскі, М. А. Янчук);

• вызначаецца агульнанародны ідэал беларусаў (сучасныя даследчыкі беларускай народнай педагогікі: Г. П. Арлова, В. С. Болбас, К. В. Гаўрылавец, В. У. Чэчат; асветнікі канца XIX – пачатку XX ст.: М. В. Доўнар-Запольскі, Я. Колас, Я. Лучына, І. А. Сербаў, Цётка).

Перад вызначэннем сутнасці і зместу паняцця «этнакультура» лічым неабходным звярнуцца да аналізу сутнасці паняццяў «нацыя» і «народнасць» у кантэксце нацыянальна-гістарычнага развіцця беларускага народа.

Сучасны беларускі філосаф А. С. Майхровіч адзначае, што працэс фарміравання беларускай нацыі адбываўся на працягу XIX ст. – эпохі «нацыянальнага Адраджэння, станаўлення і развіцця новай беларускай культуры» [146, с. 652].

Сучасныя айчынныя даследчыкі гісторыі развіцця беларускага народа В. К. Бандарчык і С. Ф. Дубянецкі паказваюць сутнасць паняццяў «народнасць» і «нацыя», а таксама вызначаюць гістарычныя межы фарміравання беларускай народнасці і нацыі. В. К. Бандарчык трактуе «народнасць» як «моўную, тэрытарыяльную, эканамічную і культурную супольнасць людзей пераважна рабаўладальніцкай і феадальнай эпох» [1, с. 283]. Так, працэс фарміравання беларускай народнасці, згодна з даследчыцкай пазіцыяй аўтара паняцця, пачаўся ў канцы XIII–XIV ст. (быў звязаны з росквітам Вялікага Княства Літоўскага ў плане «ўзмацнення інтэграцыйных працэсаў, развіцця феадальных адносін, панавання адзінай старажытна-беларускай мовы і культуры, развіцця гаспадарча-эканамічных адносін» [1, с. 283]) і завяршыўся ў XV–XVI стст. па прычыне акаталічвання і паланізацыі

вярхоў і значнай часткі сярэдніх саслоўяў, што звязана з аб'яднаннем ВКЛ і Каралеўства Польскага, затым па прычыне русіфікацыі, звязанай з далучэннем гістарычнай тэрыторыі Беларусі да Расійскай імперыі. Такім чынам, XVII – першая палова XIX ст. былі неспрыяльнымі для далейшага развіцця беларускай народнасці.

Даследчык С. Ф. Дубянецкі вызначае ўмовы развіцця капіталістычных адносін і патрэбу ў шырокай адукацыі народных мас у Беларусі, якія маюць месца з другой паловы XIX ст., як спрыяльныя для ператварэння беларускай народнасці ў «нацыю» – «устойлівую этнасацыяльную супольнасць людзей, якія пражываюць на адзінай тэрыторыі, звязаны агульным эканамічным і сацыяльна-палітычным жыццём, маюць адзіную культуру, мову і самасвядомасць» [1, с. 303].

Беларуская нацыя сфарміравалася, згодна з даследаваннямі айчынных гісторыкаў С. Ф. Дубянецкага і А. С. Майхровіча, у другой палове XIX – пачатку XX ст. на аснове этнічнай і нацыянальнай супольнасці, характэрнай для яе папярэдняй феадальнай эпохі. Такім чынам, улічваючы нацыянальна-гістарычнае развіццё беларусаў як народнасці, што папярэднічала вызначанаму перыяду, справядліва гаварыць аб асобных арыгінальных традыцыях побыту, этнакультурнага развіцця, сродкаў выхавання падрастаючага пакалення, заснаваных на асаблівасцях культуры кожнай з этнічных груп, што пражывалі на гістарычнай тэрыторыі Беларусі і ўваходзілі ў склад беларускага народа.

Навуковыя асновы вывучэння сутнасці і зместу паняцця «этнакультура» ўскладнены разнастайнасцю поглядаў сучасных даследчыкаў на ўзаемасувязь і ўзаемадзеянне паняццяў «агульная культура», «народная культура» і «этнічная культура». У прыватнасці, калектыў расійскіх даследчыкаў у складзе Я. С. Бакшэева, Г. А. Зайцавай, М. В. Монгуш вызначаюць этнічную культуру як асаблівую частку агульнай культуры, што «ахоплівае ў асноўным сферу быту і спосабы штодзённай жыццядзейнасці людзей, маючы на ўвазе, перш за ўсё, сацыяльна-культурныя асаблівасці лакальнай аднароднай супольнасці» [2]. М. А. Фадзеева паказвае ідэнтычнасць паняццяў «этнічная культура» і «этнакультура», называючы апошні моўным варыянтам.

Даследчыкі Н. А. Люр'я і С. М. Маліноўская паказваюць паняцце «этнакультура» ў кантэксце яго кампанентаў, вылучаючы антрапалагічны і сацыяльна-культурны напрамкі [3, с. 144]. Антрапалагічны напрамак спрыяе вылучэнню пэўных характарыстык этнічных груп, якія звязаны з камунікацыйнымі праблемамі, узаемадзеяннем розных этнічных груп і вылучэннем каштоўнасных падстаў самаідэнтыфікацыі ўнутры этнічнай групы [3, с. 145]. Сацыяльна-культурны напрамак звязаны з сацыяльным акружэннем этнічнай групы, яе гістарычным мінулым, фарміраваннем культуры. Згодна з даследаваннем сацыёлага М. Вэбера, этнічнасць як са-

цыяльна-культурны феномен абазначае «прыналежнасць да этнічнай групы, аб’яднанай культурнай аднароднасцю і верай у агульнае паходжанне» [4].

Этнолаг С. М. Шырокагародаў вылучыў абагульняючыя рысы этнасу: мову; веру ў агульнае паходжанне; наяўнасць агульных абрадаў і традыцый, гэта значыць культуры [5].

Відавочна, што паняцце «этнас» уключае ў тым ліку і культуру асобнай групы людзей, аб’яднаных агульнай мовай, побытам, звычаямі і традыцыямі грамадскай і сямейнай дзейнасцю. Так, з’ява этнічнай культуры не абавязкова абмежавана асобным этнасам, яна можа быць існасцю шэрагу этнасаў як свайго ўласнага, адчуваннем эмацыянальнай і сімвалічнай сувязі людзей.

Адным са значных кампанентаў этнічнай культуры з’яўляецца этнічная самасвядомасць. Ю. У. Брамлей раскрывае структуру этнічнай самасвядомасці, вылучаючы такія яе кампаненты, як «уяўленне пра тыповыя рысы “сваёй” супольнасці, яе ўласцівасцях і дасягненнях як цэлага (этнічныя стэрэатыпы), уяўленні пра агульнасць паходжання і гістарычнага мінулага народа, пра тэрытарыяльную супольнасць, пра мову і культуру, якія дапоўнены усведамленнем этнічных каштоўнасцей, інтарэсаў, комплексу эмацыянальных адносін да рэчаіснасці» [6].

Этнічная самасвядомасць звязана з паняццем «менталітэт» як устойлівай комплекснай характарыстыкай індывідуальна-калектыўнага характару, абумоўленай спецыфікай культуры, роднаснай дадзенаму этнічнаму грамадству. Менталітэт, у сваю чаргу, з’яўляецца часткай этнапедагагічнага ідэалу і залежыць ад умоў быцця і адпаведнага выхавання. Пры гэтым важную ролю выконваюць прыродна-геаграфічныя і геапалітычныя фактары, а таксама асаблівасці гістарычнага, сацыяльна-эканамічнага і палітычнага жыцця этнічнай супольнасці, якія, у сваю чаргу, знаходзяцца пад уплывам выхаваўчай мэты.

Разглядаючы беларускі нацыянальны менталітэт, айчынныя гісторыкі вылучылі яго адметныя рысы. У прыватнасці, Э. С. Дубянецкі спрабуе вызначыць адметныя рысы нацыянальнага беларускага характару праз прызму этнагенезу беларусаў, прыродна-геаграфічных асаблівасцей Беларусі, геапалітычных умоў. На думку даследчыка, у этнагенезе беларусаў значную ролю адыграў «так званы балцкі субстрат» [7, с. 30], ад якога ў скарбонку нацыянальных рыс трапілі стрыманасць і вытрымка, і ўплыў славянскіх плямёнаў, у прыватнасці ўкраінцаў, што вызначыў фарміраванне тыповых рыс беларускага нацыянальнага характару: «памяркоўнасць, гасціннасць, а таксама пэўная нерашучасць, недастатковыя актыўнасць і энергічнасць» [7, с. 30–31]. Прыродна-геаграфічны фактар, накладваючы «значны адбітак на спецыфіку гаспадарчай дзейнасці, матэрыяльнай і духоўнай культуры беларусаў» [7, с. 31], абумовіў станаўленне іх нацыянальнага характару: «Жыхарам раўнінных тэрыторый, як правіла, уласцівы спакойны, разважлівы характар. … беларуская прырода пазбаўлена рэзкіх пераходаў ад аднаго рэльефу да другога … што ў рэшце рэшт прадвызначыла фарма-

ванне чалавека з такім жа “акруглым”, ураўнаважаным характарам. Таму ў адрозненне ад многіх горскіх народаў беларусы менш энергічныя, больш спакойныя і разважлівыя» [7, с. 31]. У той жа час моцная біяэнергетыка беларускіх лясоў, а таксама праца беларусаў па апрацоўцы лясных тэрыторый пад палі для вырошчвання ўраджаю выпрацавалі «знакамітую жыццястойкасць, вынослівасць, цягавітасць беларусаў» [8, с. 31]. Пры высвятленні ўмоў развіцця нацыянальнага характару беларусаў неабходна ўлічваць геапалітычны фактар – Беларусь «знаходзіцца на своеасаблівым скрыжаванні ўсіх шляхоў паміж чатырма бакамі свету» [7, с. 32] і таму з’яўляецца жаданай тэрыторыяй для іншаземных захопніцкіх памкненняў, што заўжды вымушала беларусаў весці зацятую, перманентную барацьбу за абарону сваёй тэрыторыі, чалавечай годнасці, незалежнасці, у якой паступова выпрацоўваліся надзвычайная вынослівасць, мужнасць і цярплівасць.

Такім чынам, этнапсіхалогія беларускага народа і яго менталітэт таксама вызначылі адметныя рысы народна-педагагічнага ідэалу, якімі з’яўляюцца справядлівасць, калектывізм (як вынік абшчыннага быцця); стрыманасць, асцярожнасць, нешматслоўнасць (склаліся ў працэсе цяжкага паднявольнага жыцця, спусташальных войнаў); прастадушнасць, міралюбівасць, памяркоўнасць, надзвычайная талерантнасць (звязаны з адсутнасцю міжнацыянальнай варожасці і наяўнасцю верацярпімасці да прадстаўнікоў розных рэлігійных канфесій, а таксама арыентацыі на агульнасацыяльныя каштоўнасці). Дадзеныя рысы як ментальныя якасці беларускага народа адлюстраваліся ў яго вуснай народнай творчасці, у працы, паводзінах, грамадстве, культуры.

У. М. Конан – беларускі філосаф, даследчык этнічнай культуры і фальклору беларусаў – пры даследаванні ўзаемасувязі паняццяў «этнічная культура» і «этнапедагогіка» вызначае, што яны «ахопліваюць лад жыцця этнасу на пэўных гістарычных этапах, аўтэнтычную народную творчасць, што выявілася ў міфалогіі, абрадах, фальклоры» [9, с. 7]. Даследчык сцвярджае, што ў працэсе шматвяковага развіцця адбывалася «селекцыя найлепшых узораў народнай культуры, якія набывалі сэнс ідэалаў людской жыццядзейнасці і паводзінаў у грамадстве» [9, с. 8–9], што ў сваю чаргу забяспечыла ўсёй класічнай этнічнай культуры, зафіксаванай у XIX – XX стст., статус эфектыўнага сродку выхаваўчай і навучальнай дзейнасці. Ён робіць акцэнт на гістарызме этнічнай культуры і яе інтэгральнай частцы – народнай педагогіцы, бо «народная культура не паддаецца прынятай у культуралогіі, літаратуразнаўстве і іншых галінах гуманітарнай навукі атрыбутацыі … і храналагічнай перыядызацыі» [9, с. 9].

Народны ідэал ператвараецца ў своеасаблівы кодэкс беларускага народа – сукупнасць патрабаванняў да чалавека, правілаў і норм паводзін, – занатаваны ў розных відах вуснай народнай творчасці. Бо, як адзначае

У. М. Конан у сваім даследаванні «Ля вытокаў самапазнання: станаўленне духоўных каштоўнасцей у святле фальклору», «стваральнік фальклору – народ сцвярджаў духоўныя каштоўнасці жыцця не павучаннем, а сваім уласным жыццём» [10, с. 179].

Штодзённая свядомасць, на якую спантанна аказвалі ўплыў розныя ўмовы, паступова афармлялася, выкрышталізоўвалася ў грамадскую думку. Апошняя знайшла сваё ўвасабленне ў прыказках і прымаўках – своеасаблівай маральна-практычнай філасофіі народа, якія паступова станавіліся традыцыямі, яскрава выражанай мэтай, бо менавіта ў іх адлюстроўваліся вядучыя педагагічныя ідэі, у тым ліку ідэя аб мэтанакіраванасці ў рэалізацыі выхаваўчых намаганняў. Народ свядома кіраваўся існуючай грамадскай думкай, згодна з якой фарміраваў асобу на аснове пераемнасці паміж пакаленнямі, барацьбы за існаванне, бо для таго, каб выжыць, трэба было перадаць новаму пакаленню лепшае з усяго папярэдняга. Менавіта таму педагагічныя ідэі шліфаваліся на працягу стагоддзяў, і ў час пачатку станаўлення беларускай нацыі (канец XIX – пачатак XX ст.) была дакладна вызначана мэта – фарміраванне жыццяздольнага, працавітага, маральна і фізічна здаровага насельніцтва. Дзякуючы грамадскай думцы сфарміраваліся і захаваліся да цяперашняга часу пэўныя рысы беларуса – працавітасць, гаспадарлівасць, гасціннасць, гуманнасць, стрыманасць, справядлівасць, прастадушнасць, міралюбівасць, памяркоўнасць, што ў комплексе перадаюць нацыянальны характар, менталітэт.

У педагогіцы кожнага народа выхаванне скіравана на фарміраванне падрастаючага пакалення згодна са створаным ідэалам. Таму сярод шматлікіх скарбаў народнай педагагічнай мудрасці адно з асноўных месцаў займае ідэя ўдасканальвання чалавечай асобы. Без ідэалу немагчыма існаванне цэласнасці асобы, трываласці яе ўнутранага свету. Ідэал неабходны як крытэрый для самапрызнання, самавызначэння, ацэнкі сябе і іншых людзей, як сродак для стварэння ўпарадкаванасці ў жыццядзейнасці, прадвызначэння стратэгічнай задачы жыцця чалавека.

Расійскі філосаф М. Ф. Калашнікаў разглядае ідэал у якасці «спецыфічнай формы адлюстравання супярэчнасцей рэчаіснасці ў грамадскай і індывідуальнай свядомасці, выражанай у сістэме ўяўленняў пра тэндэнцыі змянення якога-небудзь аб’екта, якая ўключае дасканалы вобраз жадаемага як умоўна-канчатковую мэту аб’екта, прамежкавыя ідэалы-мэты, а таксама ўяўленні пра шляхі і сродкі іх дасягнення» [11, с. 68–69]. Пры ўсведамленні ідэалу асобай узнікаюць, як доказ практычнай значнасці дадзенага паняцця, наступныя супярэчнасці, пры пераадоленні якіх асоба набывае рысы дасканалага чалавека:

• паміж рэальным, дадзеным у быцці носьбіта ідэалу і адлюстраваным у яго свядомасці, і належным, гэта значыць дасканалым вобразам жадаемага;

• паміж суб'ектыўным ва ўяўленнях носьбіта ідэалу пра шляхі дасягнення дасканалага вобраза жадаемага і аб'ектыўным, гістарычна заканамерным у гэтым;

• паміж індывідуальным, выступаючым як з'ява, і агульным – яго сутнасцю [11, с. 69].

Надзвычай значнай у народнай педагагічнай думцы з'яўляецца ідэя дасканалага чалавека. У ёй ствараецца своеасаблівы ідэал, што змясціў у сабе ўсе неабходныя і лепшыя рысы чалавека, якога хацела бачыць грамадства, а таксама ўвабраў у сябе мэту, канчатковыя задачы выхавання і самавыхавання асобы. Згодна з даследаваннем «Ідэальнае і ідэал» рускага філосафа Э. В. Ільянкова, ідэал у якасці ўсеагульнай формы мэтанакіраванай дзейнасці «выступае ва ўсіх сферах грамадскага жыцця – сацыяльнай, палітычнай, маральнай, эстэтычнай і г. д.» [12, с. 204]. У сваю чаргу ідэальнае ўспрымаецца чалавекам як «суб'ектыўны вобраз аб'ектыўнай рэальнасці, г. зн. адлюстраванне знешняга свету ў формах дзейнасці чалавека, у формах яго свядомасці і волі» [12, с. 214].

Праблемам вызначэння сутнасці і зместу народнага выхавання, а таксама пастаноўкам мэты традыцыйнага выхавання падрастаючага пакалення прысвяцілі свае даследаванні айчынныя гісторыкі педагогікі і этнапедагогі. Сучасны беларускі вучоны Г. П. Арлова першаасновай беларускай народнай педагогікі лічыць культ працы. Гісторыка-педагагічны аналіз справядліва пацвярджае, што выхаванню працалюбства нашы продкі надавалі першарадную ўвагу ў тым выпадку, калі яно служыла высокім маральна-этычным мэтам і мела грамадскую накіраванасць. Гэтак жа розум і фізічная моц набывалі грамадска значную каштоўнасць толькі пры ўмове выкарыстання іх у інтарэсах людской супольнасці і ў барацьбе са злом. Калі яны выходзілі за межы маральнасці, то ўяўлялі сур'ёзную небяспеку [13]. Таму высновы, да якіх прыйшлі Г. П. Арлова і В. У. Чэчат, паказваюць, што ядром беларускай народнай педагогікі з'яўляецца паняцце дабра, якое ў якасці ўсеагульнага народнага паняцця з'яўлялася падмуркам гармоніі маральнай і фізічнай прыроды чалавека [13; 14, с. 71–73].

Вызначэнне мэты выхавання асобы з'яўляецца галоўным звяном кожнай педагагічнай сістэмы, у тым ліку і народна-педагагічнай. Спецыфічнасць народна-выхаваўчай дзейнасці, на думку даследчыка гісторыі педагогікі Беларусі В. С. Болбаса, заключаецца ў тым, што яна не «адасабляецца ў спецыяльна арганізаваны працэс і што многія палажэнні народнай педагогікі ў несфармуляваным выглядзе ўтрымліваюцца ў розных элементах духоўнай культуры» [15, с. 149].

Захаванне ў пакаленнях народна-педагагічнага ідэалу адбываецца, на думку В. С. Болбаса, «дзякуючы трансляцыі з пакалення ў пакаленне найбольш стабільных маральна-духоўных каштоўнасцей і ментальных якасцей адпаведнага соцыуму, а таксама ўзбагачэння іх агульначалавечымі каштоўнасцямі цывілізацый, бо ідэал выконвае важную менталеўтвараль-

ную функцыю і садзейнічае не толькі захаванню, але і карэкцыі і пераўтварэнню каштоўнасных жыццёвых арыенціраў» [15, с. 150]. У ходзе гістарычнага развіцця Беларусі пад уздзеяннем асаблівасцей гістарычнага лёсу, менталітэту і рэгіёну пражывання складваліся свае ўяўленні пра «дасканалага чалавека» як ідэал для падрастаючага пакалення.

Такім чынам, у выніку вывучэння прац філосафаў, гісторыкаў, сацыёлагаў, этнографаў, педагогаў сутнасць паняцця «этнакультура» ў кантэксце фарміравання беларускай нацыі разглядаецца намі як частка агульнай культуры беларусаў, якая абумоўлена сацыяльна-культурнымі асаблівасцямі супольнасці, мовай, верай у агульнае паходжанне. Этнічная культура не можа быць абмежавана асобным этнасам, яна з'яўляецца існасцю шэрагу этнасаў, дзе вызначальным будзе адчуванне эмацыянальнай і сімвалічнай сувязі людзей. Зместавыя характарыстыкі паняцця «этнакультура» ў разглядаемым кантэксце ўключаюць перш за ўсё менталітэт і этнапсіхалогію, якія, у сваю чаргу, вызначаюць ідэал, прымяняльны не толькі як устойлівая характарыстыка прадстаўнікоў пэўнай супольнасці, але і як мэта ў сямейным і грамадскім выхаванні.

**Спіс выкарыстаных крыніц**


1. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. / Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: БелЭн, 1999. – Т. 5. М – Пуд. – 594 с.

2. *Монгуш, М. В.* Этническая культура: содержание и составляющие понятия / М. В. Монгуш, А. А. Зайцева, Е. С. Бакшеев // Культурологический журнал (электронное периодическое рецензируемое научное издание. – 2014. – № 2(16).

3. *Люрья, Н. А.* Вопросы междисциплинарного анализа понятия «этнокультурный компонент» в общеобразовательной практике региона / Н. А. Люрья, С. М. Малиновская // Вестник ТГПУ. – 2013. – № 13(141). – С. 143–149.

4. *Вебер, М.* Избранные произведения / М. Вебер. – М.: Прогресс, 1990. – 808с.

5. *Широкогородцев, С. М.* Этнос. Исследование основных принципов изменения этнических и этнографических явлений / С. М. Широкогородцев. – М.: Кн. дом «Либроком», 2012. – 136 с.

6. *Бромлей, Ю. В.* Опыт типологизации этнических общностей / Ю. В. Бромлей // Советская этнография. – 1975. – № 5. – С. 61–81.

7. *Дубянецкі, Э. С.* Беларускі нацыянальны характар: спроба даследавання / Э С. Дубянецкі // АіВ. – 1995. – № 5. – С. 29.

8. *Дубровский, В. В.* Илья Копиевич (Копиевский). Памятники философской мысли Белоруссии XVII – первой половины XVIII в. / В. В. Дубровский. – Минск: Наука и техника, 1991. – С. 198–202.

9. Народная педагогіка беларусаў / У. М. Конан [і інш.]. – Мінск: Нац. ін-т адукацыі, 1996. – 165 с.

10. *Конан, У. М.* Ля вытокаў самапазнання: станаўленне духоўных каштоўнасцей у святле фальклору / У. М. Конан. – Мінск: Маст. літ., 1989. – 238 с.

11. *Калашников, М. Ф.* Идеал и его роль в формировании мировоззрения учащейся молодежи / М. Ф. Калашников / Философия и педагогика: проблемы взаимосвязи: сб. науч. тр. – Свердловск, 1988. – С. 87–94.

12. *Ильенков, Э. В.* Идеальное и идеал. Философия и культура / Э. В. Ильенков. – М.: Политиздат, 1991. – С. 203–274.

13. *Арлова, Г. П.* Беларуская народная педагогіка / Г. П. Арлова. – Мінск, 1993. – 94 с.
14. Ч*ечет, В. В.* Педагогика семейного воспитания / В. В. Чечет. – Мозырь: ООО ИД «Белый Ветер», 2003. – 292 с.
15. *Болбас, В. С.* Этычная педагогіка беларусаў / В. С. Болбас. – Мінск: Бел. навука, 2004. – 175 с.

**(Дата падачы: 20.02.2017 г.)**

*Н. Н. Морозова*
Академия управления при Президенте Республики Беларусь, Минск

*N. Morozova*
The Academy of Public Administration under the aegis of the President of the Republic of Belarus, Minsk

**УДК 378.147:338:811.111**

# К ОСМЫСЛЕНИЮ ИННОВАЦИОННЫХ ПРОЦЕССОВ ОБУЧЕНИЯ СПЕЦИАЛИСТОВ ПО ЭКОНОМИЧЕСКОМУ ПРОФИЛЮ С ЭЛЕМЕНТАМИ АНГЛИЙСКОГО ЯЗЫКА

# TO UNDERSTANDING THE LEARNING PROCESS INNOVATION OF EXPERTS ON ECONOMIC PROFILE WITH ELEMENTS OF ENGLISH

*В статье отражаются основные понятия категории «обучение», приводятся инновационные методы и активные формы обучения. Автор обосновывает необходимость практического использования иностранного языка в учебном процессе в силу применения методов анализа с английской аббревиатурой в сфере экономики и бизнеса при подготовке специалистов экономического профиля.*
*Ключевые слова: обучение; методы активного обучения; пирамида обучения; деловой английский; экономические методы; категории обучаемых.*

*The article reflects the basic concept of «training» category presented innovative methods and active forms of learning. The author proves the necessity of the practical use of a foreign language in the learning process due to the application of methods of analysis with the English abbreviation in the field of economics and business in the preparation of specialists in economics.*
*Key words: education; methods of active learning; learning pyramid; business; economic methods; categories of trainees.*

В условиях перехода на новые образовательные стандарты большое значение приобретает подготовка кадров, обладающих современными экономическими знаниями, способностью применять их на практике, осуществлять деловое общение и переписку, в том числе на английском языке. Все данные критерии и возможные компетенции предусматривают не только совершенствование системы обучения, но и внедрение нового, креативного подхода, включая симбиоз предметов, для получения максимального синергетического эффекта, и потому феномен инновационности стал реаль-